ЗАСНАВАНА 1 студзеня 1982 года

ТРЫБУНА ПРАЦЫ

Грамадска-палітычная ГАЗЕТА
БАБРУЙСКАГА раёна

№66 (2473) | Серада, 23 жніўня 2000 года | Цана 60 руб.

ДОШКА ГОНАРУ ПЕРАДАВІКОЎ СПАБОРНІЦТВА НА ЎБОРЦЫ ЎРАДЖАЮ Ў ГАСПАДАРКАХ РАЁНА

на стану на 21 жніўня 2000 года

Экіпажы камбайнаў "Дон-1500"

ХУРСАН Генадзь Мікалаевіч і ДЗЯРКАЧ Уладзімір Аркадзьевіч – механізатары калгаса "Гігант". З пачатку жніва ўбралі 210 га плошчы і намалацілі 800 тон збожжа.

ШАПЯЛЕВІЧ Уладзімір Ільіч і ЗУБ Святаслаў Іванавіч — механізатары калгаса "Гігант". На рахунку іх экіпажа 178 га ўбранай плошчы, а намалот склаў 677 тон.

КАНАВАЛАЎ Іван Васільевіч і КАНАВАЛАЎ Васіль Іванавіч – камбайнеры калгаса імя Дзяржынскага. Яны ўбралі 216 га хлебнай нівы і намалацілі 655 тон зерня.

ДЗЯМЕНЦЬЕЎ Дзмітрый Максімавіч і ПАРАМОНАЎ Рыгор Мікалаевіч — механізатары калгаса "Прагрэс". З пачатку жніва на іх працоўным рахунку – 260 га ўбранай плошчы, пры гэтым намалот склаў 461 тону.

Экіпажы камбайнаў Е-516

БАНДАРЧУК Васіль Сцяпанавіч і ЮДЗІН Юрый Цімафеевіч – механізатары калгаса імя Някрасава. Іх экіпаж убраў 132 га збожжавых, пры гэтым намалот склаў 445 тон.

Экіпажы камбайнаў СК-5 "Ніва"

ШЫРОКІ Васіль Уладзіміравіч і ШЫРОКІ Канстанцін Пятровіч — механізатары калгаса імя Дзяржынскага. Убралі 151 га збожжавых, з якіх намалочана 434 тоны хлеба.

БАНДАРЧУК Пётр Уладзіміравіч і ФУРС Валянцін Фёдаравіч — камбайнеры калгаса "Перамога". Убралі 149 га хлебнай нівы і намалацілі 366 тон зерня.

КАНТАЕЎ Аліхан Дахватавіч і КУЛІКОЎ Арцём Сяргеевіч – экіпаж камбайна саўгаса імя Леніна. На яго рахунку з пачатку жніва – 243 га ўбранай плошчы і 318 тон намалочанага збожжа.

Вадзіцелі на адвозцы ўраджаю

ДУДАРЭНКА Рыгор Аляксеевіч — шафёр калгаса "Перамога". На аўтамашыне САЗ-3507 перавёз з поля ад камбайнаў 849 тон хлеба.

БАЛЫКА Вячаслаў Васільевіч – шафёр калгаса імя А. Неўскага. На аўтамашыне МАЗ-503 перавёз з поля на ток 848 тон зерня.

ДУДАЛЬ Анатоль Арцёмавіч — шафёр калгаса "Гігант". На аўтамашыне ГАЗ-53 Б перавёз ад камбайнаў на ток 842 тоны хлеба.

Машыністы КЗС

ШКРАДЗЮК Андрэй Андрэевіч і БЯЛЯЙ Ігар Іванавіч – машыністы зернесушыльнага комплексу калгаса імя А. Неўскага. Пад іх кіраўніцтвам на таку гаспадаркі перапрацавана 1817 тон зерня.

ЧЭРНІК Пётр Дзяменцьевіч, БАНДАРЭНКА Пётр Аляксандравіч і КОБІКАЎ Мікалай Іванавіч – машыністы КЗС-20 калгаса "Перамога". На іх рахунку з пачатку жніва – 1444 тоны перапрацаванага збожжа.

АЛЁХНО Мікалай Мікалаевіч і АЛЁХНО Сяргей Мікалаевіч – машыністы КЗС-20 калгаса імя А. Неўскага. Імі дапрацавана да неабходных кандыцый 785 тон зерня.

АЎЧЫННІК Васіль Аркадзьевіч — машыніст зернесушыльнага комплексу калгаса імя Някрасава. Яго звяном прасушана і дапрацавана да патрэбнай кандыцыі за мінулы час 700 тон хлеба.

ЧАКАЕ СЯЎБА АЗІМЫХ

Яшчэ на палях ідзе ўборка ўрадажаю бягучага года, а земляробам раёна ўжо трэба дбаць аб лёсе будучага – бо на парозе сяўба азімых культур. Пад імі гэтай восенню ў гаспадарках павінна быць занята 12055 гектараў плошчы ў севазвароцце. Як стала вядома, па стану на ўчарашні дзень пад сяўбу азімых ужо было ўзарана 4557 гектараў глебы.

На жаль, такія тэмпы падрыхтоўкі да важнай сельскагаспадарчай кампаніі нікога сёння не павінны заспакойваць – таму што стаіць задача ў самыя сціслыя тэрміны ўзняць усё ворыва, каб своечасова правесці сяўбу азімых. Сваімі справамі хіба ж то могуць задаволіцца аратыя калгасаў "Гігант" і імя А. Неўскага, саўгаса "Дойнічава", якія ўжо падрыхтавалі больш чым палавіну неабходнага ворыва. Што ж датычыць калгасаў імя Пушкіна, імя XXII з'езда КПСС і некаторых іншых гаспадарак, дзе ўзарана толькі трэць плошчаў, — то ім трэба пасляшацца.

М. ВЕРАСОЎСКІ.

Уборка збожжавых і зернебабовых у гаспадарках раёна
па стану на 22 жніўня 2000 года

Назва гаспадарак:	План (га)	Убрана ў % да плана	Ураджайнасць (цнт/га)
Калгасы:			
"Гігант"	1655	92	38,7
імя Дзяржынскага	1017	92	32,7
"Перамога"	654	91	25,0
імя Пушкіна	1460	86	20,4
"Прагрэс"	839	86	18,5
імя А. Неўскага	1315	83	29,4
"Сцяг камуны"	796	82	15,7
імя Фрунзе	462	82	14,6
імя Някрасава	591	81	35,0
"Шлях Леніна"	1044	71	24,3
імя Мічурына	910	69	23,8
імя XXII з'езда КПСС	780	63	17,8
"Гарохаўскі"	1030	58	13,9
Саўгасы:			
"Кісялевічы"	15	87	20,7
"Дойнічава"	1043	82	16,0
імя Леніна	1140	80	12,5
"Бабруйскі"	1310	77	11,9
Птушкафабрыка	529	69	21,2
АГФ "Бярэзіна"	553	64	21,4
"Пятровічы"	358	59	17,9
"Осава"	1041	58	13,6
УСЯГО ПА РАЁНУ	18542	78	22,4

Ураджай — 2000



Экіпаж камбайна СК-5 "Ніва", у складзе якога працуюць Віктар Аляксандравіч Кліндзюк і яго памочнік Юрый Іванавіч Оргіш, у гэтыя дні, як і іхнія таварышы, заняты на жніве каласавых у сваім родным калгасе "Гарохаўскі". Механізатары стараюцца, імкнуцца добрасумленна выканаць свой хлебаробскі абавязак. На жаль, не заўсёды ўсё атрымліваецца так, як хацелася б – уся бяда ў тым, што часта старая тэхніка падводзіць. Аднак нягледзячы на гэта, Віктар Кліндзюк і Юрый Оргіш імкнуцца ўнесці і свой пасільны ўклад на ўборцы вырашчанага ўраджаю. Вось і ў адзін з апошніх дзён іх экіпаж змог убраць адразу ячмень на плошчы 21 гектар. І хаця намалоты сёлета ў калгасе не дужа багатыя, але важна тое, што яго механізатары стараюцца ўбраць хлеб без страт.

Фота Б. ВАРФАЛАМЕЕВА.

ПРА ХЛЕБ НАШ НАДЗЁННЫ. І НЕ ТОЛЬКІ

Шэфскія сувязі

Здавалася б, з гадамі ўзровень развіцця калектыўнай сельскагаспадарчай вытворчасці павінен быў набыць такія абароты, пры якіх ніхто з нас не выпрабоўваў бы пачуцця сораму і адчаю за яе лёс. Аднак і сёння даводзіцца канстатаваць той факт, што нашы калгасы і саўгасы па-ранейшаму знаходзяцца на мяжы эканамічнай катастрофы ці банкруцтва. Таму колькі б мы не распіналіся аб неабходнасці карэнных рэформ у гэтай важнай народнагаспадарчай галіне, але калі літаральна ў бліжэйшы час не будуць зроблены канкрэтныя, можна сказаць, рэвалюцыйныя захады ў рэанімацыі калектыўнага гаспадарання, то неўзабаве ўсе мы можам стаць заложнікамі ўласнай немэтазгоднасці.

Выказацца вось так, у нейкай ступені досыць крытычна і безнадзейна пессімістычна, мяне прымусіла сама рэчаіснасць нашага быцця. Прэзідэнт на нядаўняй рэспубліканскай селектарнай нарадзе паставіў задачу сабраць не менш 6 мільёнаў тон хлеба. Хлебаробы Мінскай вобласці ўжо на тым тыдні, да прыкладу, рапартавалі аб тым, што намалацілі мільён тон хлеба і да канца ўборачных работ змогуць гэту лічбу павялічыць амаль напалавіну. Пэўныя захады прымаюцца ў гэтым плане і ў іншых абласцях рэспублікі. Але ж якой цаной даюцца нам гэтыя тоны?

Складваецца такое ўражанне, што для выканання задачы кінуты ўсе сілы і магчымасці. Аднак задача заключаецца ў тым, каб сельскагаспадарчая галіна развівалася рытмічна, на высокім навукова абгрунтаваным узроўні. Аўралы, штурмаўшчына, кампанейшчына, азадачванне, — усё гэта толькі шкодзіць паступальнаму калектыўнаму гаспадаранню. І ўжо, калі пэўныя сілы спрабуюць не толькі затармазіць фермерскі дух, але і наогул загубіць яго, то давайце не будзем пазбаўляць творчага энтузіязму тых, хто верай і праўдай служыць прынцыпам калектывізацыі. Тым больш, што працаваць сёння на палях і фермах як ніколі цяжка і складана – і гэта, нягледзячы на тыя захады, якія прымаюцца ў калгасах і саўгасах.

У гэтым лішні раз пераконваешся, калі даводзіцца бываць на вёсцы, гутарыць з непасрэднымі вытворцамі нашых матэрыяльных даброт. Калектыў нашай рэдакцыі вось ужо на працягу пэўнага часу з'яўляецца "маральным" шэфам працаўнікоў калгаса "Сцяг камуны", таму аўтар гэтых радкоў у які раз папрасіў ягонага старшыню П.П. Дашкоўскага адказаць на шэраг пытанняў, звязаных з правядзеннем уборачных работ. І не толькі.

— Павел Паўлавіч, вам як кіраўніку калгаса, які не вызначаўся ў свой час стабільнай вытворчасцю, сёння даводзіцца выпрабоўваць моцны фінансавы ўціск. І хоць праблемы, у якіх вы аказаліся, уласцівы ў цэлым усёй нашай эканоміцы, аднак плыць па цячэнню – удзел, мусіць, людзей безініцыятыўных і недалёкіх. Як разумею, вы да такіх не адносіцеся. Праблемы – праблемамі, а ніхто з ламбаўцаў убіраць хлеб сёння не будзе. Тым больш, што для гэтага ёсць ўсё неабходнае. Ці не так?

— Ну, усё не ўсё, а сёлетняе жніво завершым. Інакш і быць не можа. На 18 жніўня мы практычна ўбралі зерневую групу. Праўда, ураджайнасць каласавых не вельмі парадавала – да 16,5 цэнтнера з гектара. Вядома, можна спаслацца на нізкі бал нашых зямель, але ж пры больш адладжанай тэхналогіі вырошчвання можна мець і куды лепшы ўраджай. У гэтым сэнсе работы непачаты край. Сёлета мы не сеялі яравую пшаніцу. І, мяркую, дарэмна. Ужо ў наступным годзе выдзелім пад гэту культуру да 20 гектараў. Што ж тычыцца тэмпаў уборкі, то яны ў цэлым адпавядалі нашым магчымасцям. З графіка не выпадалі. Хаця тэмпы тэмпамі, а ў нашай справе важна мець канчатковы вынік. Інакш кажучы, той хлеб, які ў засеках. Але падсумоўваць зробленае будзем крыху пазней.

— Не толькі ўбіраеце хлеб, але і адвозіце яго на дзяржаўныя прыёмныя пункты?

— Без гэтага ніяк нельга. Але перш чым адказаць на ваша пытанне, хацелася б спыніцца і на такіх момантах гэтага напружанага сельскагаспадарчага працэсу. Прызнацца, у мяне, як і ў іншых кіраўнікоў, былі пэўныя сумненні адносна нашай тэхнікі. Асаблівую трывогу выклікаў камбайнавы парк. Машыны ў асноўным зношаныя, не адзін год адпрацаваўшыя на жытнёвых палетках. Патрабавалі да сябе асаблівай увагі пад час рамонту. І трэба сказаць, што нашы камбайнеры ў цэлым паспяхова справіліся з пастаўленай задачай. Аб чым сведчыць і сам ход жніва. Практычна ўся тэхніка не ведала прынцыповых збояў...

— Павел Паўлавіч, прабачце, калі ласка, што перабіваю: і ўсё ж колькі хлеба паспелі здаць ужо дзяржаве?

— На сённяшні дзень (на 18.08 – аўт.) адправілі на хлебакамбінат 411 тон зерня, што значна больш намечанага задання. Праўда, і ў гэтым пытанні ёсць праблемы арганізацыйнага характару. Зноў жа, непакоіць фінансавая нестабільнасць. Прэзідэнт даў указанне разлічыцца з вяскоўцамі ў самы бліжэйшы час, але грошай пакуль няма. Мы, напрыклад, не выплацілі людзям зарплату за красавік. І гэта вельмі непрыемны факт. Праца кожнага чалавека павінна быць ацэнена. Зарплату неабходна выдаваць своечасова.

— Згодзен. Застецца толькі здзіўляцца той цярплівасці, якую праяўляюць працаўнікі сяла.

— Вось-вось... Прыемна, што людзі не толькі дасканала ведаюць сваю справу, але і шчыруюць на розных участках вытворчасці, не прад'яўляючы асаблівых патрабаванняў. Мы верым у тое, што сённяшнія цяжкасці часовыя. Крызісы прыходзяць і адыходзяць, а чалавек застаецца. Што ж тычыца нашых працаўнікоў, то яны робяць усё магчымае ў плане стабілізацыі вытворчасці. Сёння я з прыемнасцю адзначаю экіпажы камбайнераў Віктара Шпака, Генадзя Сурыновіча, Уладзіміра Крывіцкага і іншых. Усе яны заслужылі самых шчырых слоў прызнання.

—Так, жнівень на зыходзе. Ён як бы вянчае тыя намаганні, якія аддаюць сяляне ўборцы ўраджаю. І гэта добра, што і ламбаўцы, нягледзячы на глыбінныя эканамічныя праблемы, не разгубілі раней напрацаванага. Здавалася б, пасля такога напружання і дух няблага перавесці, але наперадзе не менш адказная работа — пара сяўбы азімых культур. Як у гэтым плане вы сябе адчуваеце?

— Рыхтуем глебу згодна плана. Ёсць насенне. Узарана ўжо каля 150 гектараў плошчы. Усяго ж нам трэба будзе пасеяць 490 гектараў азімага жыта. Мікалай Мікалаевіч Закрэўскі, які працуе на падрыхтоўцы глебы, са сваёй задачай спраўляецца. Тут асабліва перажываць не даводзіцца. Адзінае, што непакоіць, гэта нестабільнасць у забяспячанні палівам, і, як ужо падкрэсліваў, – праблема з выплатай зарплаты...

* * *

На жаль, падобныя праблемы з аплатай працыназіраюцца не толькі ў калгасе "Сцяг камуны". Ужо стала шкоднай звычкай яе неапраўдана затрымліваць. Адны своечасова не разлічваюцца за здадзеную прадукцыю, іншыя прывыклі толькі абяцаць і нічога не рабіць для таго, каб даць магчымасць сяляніну самому вызначаць кан'юнктуру рынка... Пакуль жа застаецца канстатаваць, што літр малака ў параўненні з літрам саляркі нічога не варты.

Пры такой палітыцы цэн дасягнуць паслаблення для хлебаробаў не ўдасца. Сёння мы яшчэ зможам убраць з палеткаў хлеб. А што будзе заўтра? Тыя чатыры-пяць новых камбайнаў, якія атрымаў раён пад час жніва, пагоды не зрабілі. Неабходна арганізаваць сельскагаспадарчую вытворчасць так, каб у кожнай гаспадарцы маглі набываць неабходную тэхніку, іншае абсталяванне, развіваць жывёлагадоўлю, весці будаўніцтва і г.д. — не пераступаючы ганкі банкаў са скінутым капялюшом і молячы крэдыты пад неапраўдана вялікія працэнты. Здабытая прадукцыя: мяса, малако, хлеб – павінны прыносіць разумныя прыбыткі.

Падрыхтаваў Якаў АБРАМОВІЧ.

Лето на фермах

БЫЛО БЫ ХОТЕНИЕ, А К НЕМУ – ТЕРПЕНИЕ

За семь месяцев текущего года удой на одну корову в совхозе "Бобруйский" составил 1014 килограммов. Это на 80 килограммов молока меньше, чем в прошлом году. На мой вопрос: "Почему такое случилось?" — зоотехник-селекционер Людмила Осипович рассказывает:

— Во-первых, на дойное стадо подействовала зимняя нехватка кормов. Скот из зимовки вышел истощенным. Мы не столько думали о большом молоке, а сколько о том, чтобы сохранить стадо, сделать его полноценным на будущее. А во-вторых, в колхозе создалась такая ситуация, что молочное стадо не пополнялось высокопродуктивными коровами. Одни убывали по старости, другие выбраковывались по различным болезням. Очень сильно подвел нас лейкоз. Из-за него потеряли как раз тех коров, от которых ожидали большого молока. А восстановить их не было чем. Закупить высокоэлитных удойных телок в совхозе нет средств, а вырастить своих – сами знаете, сколько требуется времени. Сейчас это дело поправляем и в этом году мы будем вводить своих "доморощенных" телок. К концу года стадо, думаю, укомплектуем полностью. Да и пастбища у нас не лучшие, — продолжает Людмила Петровна. – То заморозило, то высушило. Какая у нас земля – один песок... По весне мы пастбища подкормили, подсеяли – думали, что получим хорошую отдачу. Но что с засохшей травы и голого поля можно взять? Вот и оказались в отстающих.

Правда, в последнее время надои у нас стали увеличиваться. После дождей травы пошли в рост, начали молоть отходы от переработки зерна и давать их скоту. Результат налицо. Каждый день прибавка молока на корову составляет 100-200 грамм. Это уже несколько радует, вселяет надежду.

Стараемся подготовить и хорошую кормовую базу на новую зимовку. На ферме в д. Емельянов Мост назапашено сенажа 800 тонн, в д. Калиновка – 700 тонн. Начали его закладку и на ферме в д. Богушовка. Здесь планируем закрыть яму объемом в 700 тонн. Надежда на кукурузу, а она пока не плохая. Кстати сказать, в этом году и качество сенажа лучше, чем в прошлом. Рассчитываем и на фуражное зерно, солому....

Ведем одновременно работу и по обновлению стада. Сейчас руководство совхоза изыскало средства на закупку в этих целях молодняка. Своими силами нынче выращиваем 180 телят. Из них 60 голов содержится на ферме Емельянов Мост, а 120 – на ферме Богушовка. Если раньше привесы составляли в сутки 400 грамм, то сейчас – 540. Пример в работе показывает телятница из д. Емельянов Мост – это Татьяна Борисовна Петрова. Почти семь лет она работает здесь. Опыта и знаний хватает, старается.

Правда, нас пока волнуют дела на ферме в д. Богушовка. Здесь показатели привесов молодняка несколько ниже среднесовхозных. Они составляют 379 грамм. Мы сделали тщательный анализ работы этой фермы и пришли к выводу, что здесь большая скученность молодняка. Не было здесь и своего санитара. Чтобы во время проводить различную профилактику против болезней, следить за режимом и правильностью выпойки телят, санитарными нормами в помещениях. Сейчас эти упущения устранены. Здесь работают теперь добросовестные и ответственные за порученное дело телятницы. Это Елена Григорьевна Комкова и Мария Валентиновна Ковалева.

Из-за нехватки средств и людских ресурсов мы несколько опоздали с внедрением технологии выпойки телят по киселевичскому методу. Но теперь приобретены все материалы, и в скором будущем этот вопрос решим. Последний месяц работы убеждает, что наши мероприятия не пропали даром. Контрольные проверки показали, что привесы здесь возросли на 80-100 граммов. Эти результаты нас радуют.

* * *

Говорила Людмила Петровна Осипович долго, рассказывала со знанием дела. В голосе ее чувствовалась уверенность, радость за людей и их работу. Но в тоже время на круглом приятном лице ее играла заметная тень озабоченности, какой-то тревоги, душевного переживания за животноводческие дела, за то, что они идут не так, как хочется. Поэтому думается, что сидеть, сложа руки, никто не будет и в совхозе примут все меры к тому, чтобы ситуация в будущем изменилась. А для этого есть все основания.

Записал В. ИСАЕВ.



Ужо больш за 10 гадоў працуе на Бабруйскай птушкафабрыцы гэты абаяльны дуэт – Іван Якаўлевіч і Вера Цімафееўна Кірэевы. Як самі бачыце, гэта людзі вельмі прыемнага характару, якія рэдка развітваюцца з добрым настроем.

Але ў той жа час Іван і Вера – гэта вельмі працавітыя і добрасумленныя людзі, добры прыклад для моладзі. У сваім цэху яны ўдваіх вырошчваюць аж 30 тысяч нясушак.

І ў асабістым жыцці Кірэевы усё ладзіцца: іх трое сыноў заслугоўваюць таго, каб бацькі імі ганарыліся. Паболей бы ў нашых гаспадарках такіх удалых дуэтаў!

Фота Б. ВАРФАЛАМЕЕВА.

Услед за падзеяй

ДЗЕВЯТЫ ВАЛ – ПА ЎСЁЙ РАСІІ

З нагоды катастрофы расійскай падводнай атамнай лодкі "Курск".

Падлодка атамная "Курск"...
Ах, субмарына, субмарына!..
Які ж пагібельны твой курс
Быў той злашчаснаю часінай.
Цябе спаткаў суровы лёс
Сярод бязлітаснай прасторы.
За выбухамі спешны SOS
Пачуўся ў Баранцавым моры.
І грузна лёг атамаход
На ілістае дно марское.

Пад сотметровай тоўшчай вод
З шчымлівою бядой людскою.
І стаў ён, быццам саркафаг –
Для ўсіх агульнай дамавінай.
О, цар Нептун, навошта ж так –
Ў ахвяру ты бярэш бязвінных?!.
Сто васемнаццаць іх было:
Як на падбор – што рост,
што плечы.
Які кашмар... Якое ж зло!..

Які ж ён здзек бесчалавечны...
Ў марскім бяздонні крэйсер змоўк,
Што быў нядаўна грозный сілай.
І Бог яму не дапамог,
І чалавек тут быў бяссільным.
Бы анямеў марскі прастор,
І хвалі ўлегліся сівыя.
На моры – штыль,
а ў душах – шторм...
Дзевяты вал – па ўсёй Расіі...

Уладзімір РУДЗІНСКІ.

Проблемы развития АПК

КАК ЖИВЕШЬ, СЕЛЬЧАНИН?

Разговор шел тихий, деловой. Говорили об урожае, который, несмотря на заморозки и весеннюю жару, должен быть выше, чем в прошлом году, о подготовке техники и зернотоков к предстоящей уборке, о том, кто из специалистов там будет работать. И справятся ли? Но, после коротких обсуждений пришли к выводу, что люди подобраны знающие, болеющие за порученное дело, они не подведут. Не обошли вниманием и фермы. Всех заботило одно: как бы в этом году прокормить скот. Спорили, почему на одной ферме надои больше, а на другой меньше, где на лугу лучшие травостои и когда там нужно начинать вторую косовицу.

Словом, собравшиеся вечером на скамейке под большой развесистой березой, чтобы отдохнуть после напряженного трудового дня, мои соседи и здесь думали о жизни колхоза, его делах, старались высказать свою точку зрения, в том числе о наболевшем, когда видели неправомерность действий того или иного руководителя производственного подразделения. Их волновало все... А как они радовались, когда в колхоз завезли горюче-смазочные материалы, что зав. мастерскими наконец нашел запчасти к "Дону-1500", и он не сегодня-завтра будет готов к выходу в поле; что новый председатель подумывает о возрождении свинофермы. Здесь все были едины: нужное дело! И своего руководителя нужно поддержать. Не было ни одного вопроса, которого не касались бы мои собеседники, и было видно, что дела колхоза их волнуют больше всего, что с ним они связывают всю свою жизнь, болеют за него, строят планы на будущее.

А вот про свое житье-бытье никто ни слова. И когда я заговорил, все сразу как-то притихли, стали задумчивыми. Потом, после непродолжительной паузы одна из молодых, еще не потерявшая своей красоты, соседка сказала:

— Если бы в колхозе во время давали зарплату, то у нас в семье не было бы никаких проблем. А так... вот посудите сами. Мы с мужем вдвоем работаем в колхозе. Я кладовщиком, а он – бригадиром тракторной бригады... Правда, зарплата не ахти какая, но... мы ее видим раз в квартал. А что толку, когда ее получишь. Цены-то выросли. И в результате получается, что на руки тебе достаются одни копейки. А ведь у нас двое детей. Скоро будет третий ребенок.

— А как же живете? — Не утерпел я.

— Очень просто, — ответила соседка бойко. – Получаем пособия на детей, мать немного помогает, имеем свое хозяйство. Убили кабанчика, есть сало, мясо. Кое-что свезли на базар. Потом картошки излишек продали. Есть корова, куры, индюки... В магазин ходим только за самым необходимым: купить хлеба, соли, детям кое-какие обновки. Это уже когда на базаре со своими товарами побываем. Словом, если работаешь, не спишь в шапку, а крутишься, то можно жить. Правда, тяжеловато, об отдыхе и думать не приходится, но... Может, когда все наладится, и мы заживем не хуже тех, зарубежных. На жизнь пока не обижаюсь. Лишь бы все было тихо и мирно, чтобы наши дети не знали раздора, а жили в согласии и понимании. Конечно, кто любит выпить, погулять – тому приходится не сладко. Само собой в карман ничто не придет. Нужно потрудиться...

Точку зрения бойкой соседки поддержали и другие собеседники. После некоторых высказываний и споров пришли к выводу, что подсобное хозяйство сильно выручает селянина и помогает ему держаться на плаву. Но все почему-то были за колхоз.

— Свое хозяйство хорошо, — горячился второй сосед. Было видно, что ему наболело, и он хочет выложиться, как на духу.

— У меня есть лошадь, скотина. Сею вовремя, убираю – тоже. Обрабатываю всего где-то около гектара земли. Но все получается как-то спонтанно, наскоком... На базаре не всякий раз продашь удачно. Сколько нужно нервов, силы, чтобы сбыть выращенный урожай... В этом году хотел оптом сдать картофель в Бобруйский плодоовощторг. Но там дали отворот поворот. Стоять на базаре нет времени. Работаю водителем в колхозе, жена в детском садике. Времени свободного в обрез. Хорошо, что она вовремя получает зарплату. Вот так и живем...

В колхозе, как не крути, отработана агротехнология возделывания полей, на фермах — тоже есть где применить достижения науки и техники... А в личном хозяйстве? Не очень. Этот человек хоть имеет лошадь... Она ему здорово помогает. Но у других-то такой нет. А купить не позволяют ресурсы. Вот попробуй, проведи вовремя уборку или сев урожая... Не каждому – под силу.

С этими рассуждениями сельчане вполне согласны. Мне самому пришлось испытать такое. Немало потратил сил и нервов, пока отсеялся. Взять в колхозе лошадь – большая очередь. Пойти к частнику – там тоже самое: то нет времени у хозяина, то загибали такую цену, что за нее можно было купить столько же картошки и капусты, сколько вырастет на огороде. Тоже самое — и с уборкой.

— Мы держимся на плаву благодаря родителям. Они получают пенсию. Делятся с нами, — вступил в разговор третий сосед. – Я сам в колхозе работаю строителем. А жена с ребенком дома. Он у нас часто болеет, приходится по больницам возить... Торговлей заниматься нет времени. Подсобляет личное хозяйство: свое молоко, овощи, фрукты... Сами уже как-нибудь, а вот за колхоз обидно, — он вздохнул. — Разве может он стать на ноги, если за литр бензина нужно отдать пять литров молока, а то и больше... Или взять такое. Не успели убрать урожай, а он уже пошел в заклад на горюче-смазочные материалы. Зерно взяли по ценам еще февральским, а за бензин уже нужно платить по нынешним. Вот и получается, — подвел он итог, — что сами себя загоняем в угол. Дали бы колхозу самому распорядиться своими результатами труда, так нет... Находятся на них другие хозяева. А мы, вроде как сторонние наблюдатели.

Он на некоторое время задумался а потом продолжил:

- Мы сдаем государству молоко, мясо... А расчет получаем по прошествии четырех-пяти месяцев. В связи с инфляцией наше хозяйство теряет очень много...

Надолго затянулась в тот вечер беседа. Почти за полночь... О многом было переговорено. Но ни в одном разговоре я не уловил растерянности, малодушия, безысходности – а наоборот, у каждого была вера в завтрашний день, в свой коллектив, в то, что над головой всегда будет мирное небо и счастье коснется их семей. А если есть уверенность, то и жить легче.

В. ИСАЕВ,
колхоз им. Мичурина.

ЗАКУП МАЛАКА
АД НАСЕЛЬНІЦТВА Ў ГАСПАДАРКАХ РАЁНА
за сем месяцаў 2000 года

Назва гаспадарак:	Закуплена на карову (кг)		Назва гаспадарак:	Закуплена на карову (кг)	
	2000 г.	1999 г.		2000 г.	1999 г.
Калгасы:			імя Мічурына	369	289
"Прагрэс"	1343	1065			
імя Неўскага	1266	1054	Саўгасы:		
"Перамога"	1037	819	"Дойнічава"	1103	1011
"Пігант"	939	801	"Кісялевічы"	831	594
імя Дзяржынскага	849	801	"Бабруйскі"	590	512
"Шлях Леніна"	709	513	імя Леніна	575	495
"Гарохаўскі"	688	690	"Осава"	562	423
"Сцяг камуны"	657	468	АГФ "Бярэзіна"	438	218
імя Някрасава	633	673	"Пятровічы"	379	270
імя Пушкіна	568	475	Птушкафабрыка	293	174
імя Фрунзе	430	240			
імя XXII з'езда КПСС	428	322	УСЯГО ПА РАЁНУ	682	553

Тревожный сигнал

В ОЖИДАНИИ ЗАРПЛАТЫ

Согласно статистике, таких огромных задержек по выплатам заработной платы в масштабах республики не было с 1996 года! И в первую очередь страдают люди, работающие в системе агропромышленного комплекса. Наш район, к сожалению, исключением не стал. В большинстве хозяйств положение с выплатами или плохое, или катастрофическое. Люди честно работают, даже можно сказать вкалывают, а заработанное не получают по несколько месяцев. Понятно, что виновата ныне существующая, неоднократно критиковавшаяся экономическая система, а никак не простые работяги, ставшие заложниками этой системы. Но от объяснений легче не становится. Если бы не подсобные хозяйства, людям целыми семьями пришлось бы голодать. Но не будем представлять самые грустные картины. Остановимся на конкретном примере.

У Валентины Михайловны Шило из деревни Мосты Гороховского сельсовета пятеро детей. Трое из них – школьники. Ручки, тетради, одежду, обувь – все это хотелось бы успеть купить за оставшуюся неделю. Но не за что. Пенсия у Валентины Михайловны – 23 тысячи, все деньги, естественно, уходят на продукты. А как же муж, Владимир Ильич? Он что, не работает? Да нет, работает, и считается очень даже хорошим трактористом в колхозе "Гороховский". Но зарплату не получает аж с марта месяца. Рядом живут семьи, в которых такая же ситуация, а то еще и хуже.

В преддверии выхода этого номера газеты мы узнали, что на днях все-таки выплатили в "Гороховском" зарплату за март. А также появилась надежда, что при условии перечисления от хлебокомбината денег за зерно, будет осуществлен расчет за другие месяцы.

Воплотится ли надежда в действительность, мы узнаем в ближайшие дни.

Социальная сфера

В ПРИЦЕЛЕ – ГОРБАЦЕВИЧИ



Похоже, что всеобъемлющее понятие социального благополучия на селе за годы, прошедшие с начала горбачевской перестройки, неуклонно превращаются в понятие все более узкое. Сказать остается разве что: спасибо, что совсем не исчезает.

Конечно, безусловно положительной стороной сельской жизни стало проведение в последние годы семинаров по благоустройству. Это хороший стимул для каждого хозяина оценить внешнюю привлекательность своего жилья, да заодно, может быть, подумать и о внутреннем его содержании.

